**Электронны бюлетэнь: ЛГБТК+ у Беларусі**

*01-04.2025*

**ЗМЕСТ:**

1. Становішча беларускай ЛГБТК+ супольнасці
2. Асвятленне ЛГБТК+ тэматыкі ў беларускіх масмедыя
3. Навіны Праваабарончай ініцыятывы “Журналісты за талерантнасць” (J4t) / Gpress.info

## 1. СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКАЙ ЛГБТК+ СУПОЛЬНАСЦІ

Становішча ЛГБТК+ людзей у Беларусі заставалася вельмі трывожным у перыяд са студзеня па красавік 2025 года з-за працяглых жорсткіх рэпрэсій у краіне. Прыўладны рэжым працягваў пераслед ЛГБТК+ актывістаў, паведамлялася пра пачашчэнне бязлітасных міліцэйскіх рэйдаў, накіраваных супраць квір-праваабаронцаў ды іншых прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці. Паводле сведчанняў ЛГБТК+ асобаў з ліку былых палітвязняў і арыштантаў, у тым ліку вядомага

беларускага блогера Vadimati, у зняволенні яны зазнавалі катаванні і іншыя бесчалавечныя і здзеклівыя дзеянні з боку прадстаўнікоў улады.

Падобныя высновы былі таксама зроблены Групай незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі ў Цэнтры ААН па правах чалавека ў лютым 2025 года. Паводле слоў кіраўніцы групы Карыны Маскаленка, урад Беларусі «здзейсніў шырокамаштабныя парушэнні правоў чалавека ў дачыненні да грамадзянскага насельніцтва краіны, *некаторыя з якіх прыраўноўваюцца да злачынстваў супраць чалавечнасці*».

Сярод іншага, кіруючы рэжым «брутальна абыходзіўся з ЛГБТК+ асобамі, ужываючы фізічны гвалт і дэгуманізуючую мову» падчас адвольных затрыманняў, а таксама падчас знаходжання ЛГБТК-людзей пад вартай. Падкрэслівалася, што партнёры / партнёркі затрыманых таксама зазнавалі катаванні і прыніжэнні.

3 красавіка 2025 года Савет ААН па правах чалавека прыняў рэзалюцыю аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. У гэтым дакуменце орган ААН выказаў шкадаванне з прычыны ўзмацнення дыскрымінацыі, гвалту і рэпрэсій у дачыненні да ЛГБТІ асоб у краіне.

Гэтыя сцверджанні былі падтрыманыя ў штогадовай справаздачы аб стане правоў чалавека ў Беларусі за 2024 год, апублікаванай Amnesty International у красавіку 2025 года. Паводле гэтай міжнароднай праваабарончай арганізацыі, «ЛГБТІ-супольнасць працягвае сутыкацца з пераследам, у тым ліку з адвольнымі арыштамі». Затрыманні ў асноўным адбываліся нібыта за «дробнае хуліганства» і падпіску на «экстрэмісцкія» матэрыялы, а таксама за «выраб і распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў», што з'яўляецца крымінальным злачынствам паводле артыкула 343 Крымінальнага кодэкса Беларусі. (У красавіку 2024 года Міністэрства культуры Беларусі абнавіла афіцыйнае вызначэнне «парнаграфіі» ў падзаконным акте гэтага дзяржаўнага органа. Гэтак у вызначэнне былі дададзеныя «нетрадыцыйныя сексуальныя адносіны і/або сексуальныя паводзіны». Таксама было ўдакладнена, што абноўленае вызначэнне ўключае, сярод іншага, *аднаполыя і бісексуальныя стасункі па ўзаемнай згодзе.*)

На пачатку 2025 года кіруючы рэжым працягваў «прасоўваць» свой праект закона супраць «прапаганды ЛГБТК+». Гэтак, у лютым 2025 года Генеральная пракуратура прапанавала ўраду «ўкараніць комплексны падыход да забеспячэння інфармацыйнай бяспекі дзяцей у Інтэрнэце». У спісе агучаных пагрозаў было «навязванне нетрадыцыйных каштоўнасцяў». Генеральны пракурор Беларусі Андрэй Швед неаднаразова заяўляў беларускім дэпутатам, што ў краіне будзе праследвацца «прапаганда ідэй чайлдфры і гомасексуальнасці». Таксама ён абвясціў, што бацькам будзе пагражаць большая адказнасць у выпадку «невыканання імі сваіх абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзяцей». Відавочна, гэтая заява пацвярджае рэальную небяспеку праследу сем'яў з квір-бацькамі і/або квір-дзецьмі ў Беларусі.

7 лютага 2025 года ніжняя палата беларускага парламента ў першым чытанні ўхваліла папраўкі да Закона «Аб правах дзіцяці». Гэтыя папраўкі ўключаюць строгія абмежаванні на распаўсюд інфармацыі па тэматыцы ЛГБТК+. Прапанаваныя змены ўключаюць забарону «прапаганды гомасексуальных адносін, змены полу, педафіліі і бяздзетнасці». Інфармацыя, якая лічыцца «шкоднай для здароўя і развіцця дзяцей», будзе маркіравана паводле ўзроставых катэгорыяў. Гэта фактычна пазбаўляе падлеткаў і моладзі доступу да яе.

Беларусь заняла 44-е месца з 49 краін у апошняй Rainbow Map, апублікаванай ILGA-Europe. Сярод іншага, у штогадовай справаздачы адзначалася, што ЛГБТІ-асобы ў краіне церпяць ад сістэмных рэпрэсіяў. Таксама падкрэслівалася, што іх правы сістэматычна парушаюцца з выкарыстаннем дыскрымінацыйных законаў і гвалту.

З-за праследу, дыскрымінацыі і высокіх рызыкаў для бяспекі даволі шмат беларусаў з ЛГБТК+ супольнасці былі вымушаныя ўцякаць з роднай краіны. На жаль, некаторым з іх апынулася складаным атрымаць міжнародную абарону за мяжой, напрыклад, у Балгарыі.

## 2. АСВЯТЛЕННЕ ЛГБТК+ ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ МАСМЕДЫЯ

Дзяржаўныя і праўладныя прапагандысты працягвалі свае намаганні па стыгматызацыі прадстаўнікоў беларускай ЛГБТК+ супольнасці, распальваючы нянавісць да яе прадстаўнікоў у беларускім грамадстве як да «заходніх чужынцаў», ухваляючы гамафобную палітыку ў іншых краінах, напрыклад, у Венгрыі, і прасоўваючы намаганні дзяржаўных уладаў, скіраваныя на забарону любых праяваў квірнасці, а таксама любых дыскусіяў па пытаннях сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці (SOGI) у Рэспубліцы Беларусь.

У перыяд са студзеня па красавік 2025 года незалежныя беларускія СМІ ў асноўным падтрымлівалі ЛГБТК+ супольнасць, асвятляючы праблемы, з якімі сутыкаюцца беларускія квір-людзі як унутры краіны, гэтак і ў эміграцыі. Акрамя таго, яны падкрэслівалі вельмі небяспечную тэндэнцыю распальвання нянавісці і ўжывання экстрэмальнага гвалту ў дачыненні да ЛГБТК-людзей з боку беларускіх уладаў, а таксама іх спробы зрабіць усю квір-супольнасць у краіне незаконнай.

## 3. НАВІНЫ ПРАВААБАРОНЧАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ “ЖУРНАЛІСТЫ ЗА ТАЛЕРАНТНАСЦЬ” (J4T) / GPRESS.INFO

Інтэрнэт-сайт Gpress.info / Gaypress.eu працягваў рэгулярна інфармаваць беларускую ЛГБТК+ супольнасць у Беларусі і ў выгнанні аб развіцці становішча прадстаўнікоў квір-супольнасці, даючы парады аб тым, дзе атрымаць дапамогу і як заставацца ў бяспецы, знаходзячыся ў краіне, а таксама як выехаць у больш бяспечныя краіны ў выпадку неабходнасці.

Акрамя таго, рэдакцыйныя артыкулы на сайце і ў сацсетках Gpress.info / Gaypress.eu працягвалі ўзмацняць голас квір-ініцыятыў і актывістаў грамадзянскай супольнасці, выступаючы ў падтрымку ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі і працягваючы сяброўскую руку беларускім квір-людзям у вымушанай эміграцыі.

***Gpress.info*** у сацыяльных сетках і мэсэнджэрах:

TikTok

Telegram

Facebook

Instagram

VK

Twitter

YouTube

Электронная пошта: gaypresseu@gmail.com

**© Праваабарончая ініцыятыва “Журналісты за талерантнасць”, 2025**

*Спасылка на Праваабарончую ініцыятыву “Журналісты за талерантнасць” пры выкарыстанні матэрыялаў Электроннага бюлетэня “ЛГБТК+ у Беларусі” з’яўляецца абавязковай.*